друг без друга и необходимость развития каждого из них для повышения эффективности в целом.

Список использованных источников

1. Матвеева, Е. С. Понятие экономической безопасности государства и ее место в системе национальной безопасности / Е. С. Матвеева // Молодой ученый. – 2017. – № 3. – С. 367–369.

2. Картакаев, Э. А. Конкуренция: ее виды и экономическая роль / Э. А. Картакаев // Национальные экономические системы в контексте формирования глобального экономического пространства. – 2019. – № 1. – С. 42–45.

3. Должикова А. С. Неценовая конкуренция: теория, практика / А. С. Должикова // Экономика и управление народным хозяйством: генезис, современное состояние и перспективы развития. – 2018. – С. 264–268.

4. Продовольственная безопасность: термины и понятия: энциклопедический справочник / В. Г. Гусаков, З. М. Ильина, В. И. Бельский [и др.]. – Минск : Белорусская наука, 2008. – 536 с.

5. Нигметов, Е. Н. Угрозы обеспечения экономической безопасности / Е. Н. Нигметов // Менеджмент в социальных и экономических системах. – 2019.– С. 241–244.

УДК 378.1

## РОЛЯ САЦЫЯГУМАНІТАРНЫХ ВЕДАЎ У ФАРМІРАВАННІ ГЕНЕРАЛІСТА ЯК ДЗЕЙСНАГА СУБ'ЕКТА КУЛЬТУРЫ

Жылко У. А., ГрГУ імя Янкі Купалы, Гродна
E-mail: uliana915@mail.ru

*У сучасных умовах інтэнсіўнага сацыякультурнага развіцця ў грамадстве актуалізуецца патрэба ў спецыялістах шырокага профілю – генералістах. У артыкуле разглядаецца роля сацыягуманітарных ведаў у фарміраванні генераліста як дзейснага суб'екта культуры.*

*Ключавыя словы: генераліст, суб'ект культуры, сінтэз ведаў, сацыягуманітарныя веды, універсальныя кампетэнцыі.*

## THE ROLE OF SOCIO-HUMANITARIAN KNOWLEDGE IN THE FORMATION OF THE GENERALIST AS AN ACTIVE SUBJECT OF CULTURE

*In today's conditions of intensive socio-cultural development in society, the need for specialists – generalists – is becoming urgent. The article examines the*

*role of socio-humanitarian knowledge in the formation of a generalist as an effective subject of culture.*

*Keywords: generalist, subject of culture, synthesis of knowledge, socio-humanitarian knowledge, universal competences.*

На сенняшні дзень пытанні значнасці сацыягуманітарных ведаў у змесце сучаснай адукацыі набываюць асаблівую актуальнасць. У першую чаргу гэта звязана з мадэрнізацыяй працэса адукацыі, развіццем постмадэрнісцкіх уяўленняў пра навуковыя веды і постнекласічнай рацыянальнасцю. Галоўная мэта адукацыйнага працэсу – падрыхтоўка суб’екта, які валодае ўніверсальнымі якасцямі, шырокім кругаглядам і высокім узроўнем эрудыцыі, які дазволіць яму быць гнуткім і мабільным у імклівых і зменлівых умовах сацыякультурнага развіцця, хутка адаптавацца да патрэбаў грамадства ў абранай сучаснага працоўнай сферы, валодаць наборам патрэбных ключавых кампетэнцый, без якіх немагчыма дзейнасць сучаснага чалавека ў інтэлектуальнай, грамадска-палітычнай, камунікацыйнай, эканамічнай і іншых галінах сацыякультурнага развіцця.

Глабальныя працэсы інфарматызацыі грамадства, тэхнізацыі жыццядзейнасці абумоўліваюць дынаміку развіцця культуры і месца чалавека ў складаным і шматкампанентным працэсе сацыякультурнага развіцця. Неабходны інтэлектуальны патэнцыял гарманічанага развіцця грамадства найперш звязаны з неабходнасцю падрыхтоўкі такога ўніверсальнага спецыяліста, які выступае крэатыўным, культуратворчым рэсурсам і рухавіком паспяховай інавацыйнай дзейнасці.

Як слушна заўважаюць даследчыкі, аналіз і сінтэз, як метады навуковага пазнання, а таксама спецыялізацыя і ўніверсалізацыя, як спосабы арганізацыі працы, даюць максімальны эфект у розных умовах і для дасягнення розных задач. Да гэтага часу ў большасці сфер чалавечай дзейнасці пераважалі аналіз і спецыялізацыя. Аднак сення спецыялізацыя, як спосаб арганізацыі сумеснай працы, блізкая да вычарпання сваіх пераваг у сацыяльна-эканамічнай сферы, паколькі рознасці, што ляжаць у яе аснове, паслядоўна пераходзяць пад кантроль тэхнасферы [1, с. 54].

Гэта патрабуе выхаду на першы план якасна іншага тыпу твоцаў – генералістаў або ўніверсалістаў. Яны адрозніваюцца лімітавым разуменнем прычынна-следчых сувязяў і здольныя да індывідуальнага мадэлявання працэсаў, якія адбываюцца ў тэхнасферы. Адначасова з гэтым генералісты павінны цалкам ясна разумець прычыны, каштоўнасці і сэнсы ўсякай чалавечай дзейнасці, гэта значыць тое, што недасяжна тэхнасферы [1, с. 54].

У масавым грамадстве праблема суб’екта застаецца адной з найбольш складаных. Феномен суб’екта заўжды прыцягваў увагу і разглядаўся ў якасці парадыгмы ці эталона. Тэрмін «генераліст» можа асацыявацца з наступнымі вядомымі тэрмінамі: эрудыт, універсал, спецыяліст шырокага

профілю. Тэрмін «generalists» паходзіць ад назоўніка «generalisation», які перакладаецца з англійскай мовы, як «абагульненне». Такім чынам, генераліст – гэта спецыяліст, здольны з дапамогай сістэмных падыходаў і метадаў абагульніць разнастайныя меркаванні і веды аб аб'екце даследавання [2]. Паказальна, што падобны тэрмін існуе ў галіне біялогіі і абазначае арганізм, здольны выжыць у самых разнастайных умовах навакольнага асяроддзя. Дадзеная ўласцівасць жывога арганізма быць устойлівым да зменлівых умоў экстрапалюецца на суб’екта культуры дэманстраваць універсальныя здольнасці ў любой сферы дзейнасці.

Яшчэ Арыстоцель у сваіх навуковых пошуках звярнуў увагу на адрозненні паміж проста адукаванага чалавека і добра адукаванага? Проста адукаваны чалавек мяркуе самастойна толькі наконт канкрэтных спецыфічных рэчаў, што палягаюць у галіне яго экспертнасці. Добра адукаваны чалавек мае свае арыгінальнае меркаванне літаральна пра ўсе аспекты рэчаіснасці.

Калі звярнуцца да тэхнічных спецыяльнасцей, то ў межах іх фарміраванне генераліста ўяўляецца актуальным. Усякі генераліст павінен быць здольны да індывідуальнага макраэканамічнага і макратэхнічнага мадэлявання, выкарыстоўваючы фізічныя, эмацыйныя, інтэлектуальныя і каштоўнасна-сэнсавыя аспекты свайго ўласнага «Я». У гэтай сувязі такога роду асоба павінна выхоўвацца і развівацца грамадствам мэтанакіравана. Усе найважнейшыя дасягненні чалавечай цывілізацыі павінны быць індывідуальна засвоены і прыдатныя для індывідуальнага практычнага прымянення. Адзін для аднаго генералісты выступаюць у першую чаргу як крыніцы актуальнай інфармацыі, спосаб рэгулярнай праверкі адэкватнасці сваей мадэлі, а таксама выконваюць функцыю этычнага камертону [1, с. 53].

Вялікую ўвагу ролі адукацыі у вырашэнні сусветных праблем і пераадоленні крызісу падкрэслівае эстонскі сацыелаг, педагог і грамадскі дзеяч Юла Вааглайд. Найперш, ен канцэнтраваў увагу на зменах у краіне. Блізкім да гэтай тэмы з’яўляецца другі напрамак яго навуковай дзейнасці: фарміраванне «генералістаў» – асоб з асаблівым сістэмным спосабам мыслення, якое дазваляе ім назіраць рэальнасць у дастаткова шырокім кантэксце. На думку Вааглайда, перадумовы фарміравання генералістаў – гэта сапраўднае выкананне грамадзянскіх правоў у межах дэмакратычнага грамадства. Гэта і есць галоўныя ўмовы для магчымасці асобы самастойна рабіць або «прымаць» значныя рашэнні. Сучасны адукацыйны працэс павінен садзейнічаць фарміраванню ўніверсальнага адмыслоўцы з шырокім спектрам кампетэнцый, адпавядаючых сацыякультурным запытам.

Генералісты, такім чынам здольныя, з аднаго боку, да разумення доўгатэрміновых прычынна-выніковых сувязяў і кіраванню любой галіной як адзінай сістэмай у межах культуры, а з другога боку – да разумення прычын, каштоўнасцяў і ўвогуле сэнсу ўсяго існавання чалавецтва. Вялікі

патэнцыял фарміравання генераліста ляжыць у тым ліку ў галіне гуманітарыстыкі, відавочны крызіс якой назіраецца ў апошнія дзесяцігоддзі.

Выдзелім асноўныя аспекты вызначальнай ролі сацыягуманітарных ведаў у фарміраванні генераліста як дзейснага суб’екта культуры. Калі ў прыродазнаўчых дакладных навуках асноўнай мэтай даследавання з’яўляецца рашэнне канкрэтнай тэхналагічнай задачы, то ў гуманітарыстыцы заўседы мэтай даследавання з’яўляецца вызначэнне культурных сэнсаў чалавечага жыццядзеяння. Відавочна, што ў гуманітарыстыцы перавага аддаецца абагульненню. Менавіта таму значнасць гуманітарыстыкі для фарміравання генераліста абумоўлена яе патэнцыйнай магчымасцю сфарміраваць у асобы здольнасць да ажыццяўлення сінтэзу.

Гуманітарыстыка вывучае свет, створаны чалавекам з пазіцыі яго духоўнага зместу і культурнай каштоўнасці. Яна абапіраецца на значнасць рэчаў, на сэнс. У аснове культуратворчага працэсу, уласціваму людзям, ляжыць здольнасць да функцый азначвання і інтэрпрэтацыі: гуманітарыстыка цесна звязана са шматлікімі знакавымі сістэмамі і адносінаў гэтых сістэмаў да рэчаіснасці. Як слушна заўважыў беларускі культурфілосаф А. У. Рагуля, рэцэпцыя культуры, яе рэфлексія, значыць і ўвесь працэс адукацыі і выхавання павінны адпавядаць прынцыпу інтэнцыйнага канструявання. Дзейсным суб’ектам, і найперш у кіраўнічай дзейнасці, можа быць асоба, якая валодае сумарным духоўным вопытам, здольным спалучаць у адзіны сэнс кантэкстуальныя сэнсы гісторыі і сучаснасці [3, с. 56]. Гэта безумоўна абумоўлівае здольнасць генераліста выяўляць заканамернасці і тэндэнцыі і на іх аснове прагназаваць магчымыя наступствы і вынікі развіцця сацыякультурнага працэсу, прадбачыць і прадухіліць непажаданыя з іх.

Разнастайныя метады і падыходы сацыягуманітарных ведаў дазволяць генералісту прагназаваць і мадэляваць будучыню, адштурхоўваючыся ад сэнсавага чынніку: успрымаць свет як цэласнасць, бачыць усе яго бакі і даваць ацэнку, прымаць лесавызначальныя рашэнні на розных узроўнях, прадбачыць наступствы гэтых рашэнняў. Канцэпталагічны аспект сацыягуманітарных ведаў дае магчымасць узыходзіць ад прыватных момантаў да абагульненняў, шліфаваць мысленне, пашыраць погляд на рэчы, упісваць у кантэкст і парадыгму праз этапы выяўлення праблемнай сітуацыі, тэмы, матыва, фрэйма. Сацыягуманітарны дыскурс, дзякуючы комплекснасці і сістэмнасці, уплывае на ўсебаковую распрацоўку асабістага я: сферу мыслення, сферу ўяўлення, сферу пачуццяў і эмоцый. Гэта забяспечвае высокі і дзейсны ўзровнень станаўлення генераліста.

Асноўнымі задачамі сацыягуманітарных ведаў з'яўляюцца развіцце духоўнага патэнцыялу асобы, фарміраванне творчага ўяўлення, крэатыўнага мыслення, мастацкага густу, уменне разумець і аналізаваць сацыякультурны кантэкст, уменне выяўляць асаблівасці культуры, дзе будзе ўкараняцца, рэалізоўвацца гатовы прадукт. Менавіта разуменне генера-

лістам сацыяльнага кантэксту сваей дзейнасці, вывучэнне заканамернасцей грамадскага развіцця, прагназаванне прыемаў пераўтварэння сацыяльнай прасторы, прадбачанне небяспекі і праблем, з якімі сутыкаюцца людзі ў сацыяльных дзеяннях, выяўленне спосабаў іх пераадолення і вырашэння. Асобу генераліста найперш характарызуе сістэмны светапогляд і сістэмнае мысленне.

Усе вышэйпералічанае дазваляе выявіць асноўныя функцыі генераліста,фарміраванню якіх садзейнічае сацыягуманітарны аспект адукацыі. Такія функцыянальныя абавязкі абумоўліваць высокія патрабаванні да яго асобы:

– выпрацоўка і фармуляванне каштоўнасцей і сэнсаў чалавечай дзейнасці;

– распрацоўка інструментаў эмацыйнага падмацавання каштоўнасцей і сэнсаў чалавечай дзейнасці [1, с. 54];

– інтэлектуальнае фармуляванне мэт і задач для асобных сфер дзейнасці, уплыў на сацыякультурны працэс, кантроль над іх паспяховым функцыянаваннем;

– фарміраванне дакладных прагнозаў будучыні, вызначэнне стратэгіі развіцця і сродкаў дасягнення новай сацыякультурнай рэальнасці.

Такім чынам, відавочна, што выпрацоўцы функцыянала генераліста акурат садзейнічае сацыягуманітарная сістэма ведаў. Выхаванне новага пакалення генералістаў – найважнейшая грамадская задача бліжэйшых дзесяцігоддзяў, паколькі ва ўмовах імклівага інавацыйага развіцця грамадства надзвычай узрастаюць патрабавнані да ўзроўню інтэлектуальнага і маральнага развіцця работніца любой сферы, яго здольнасці хутка і сацыяльна бяспечна, змяняць стратэгіі прафесійнай дзейнасці, адаптавацца да зменлівых умоў.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Анохов, И. В. Специалисты и генералисты / И. В. Анохин // Управление. – 2021. – Т. 9 – № 3. – С. 46–55.

2. Мокий, В. С. Перспективы обучения генералистов в структуре высшего образования [Электронны рэсурс] / В. С. Мокий // Universum: Психология и образование: электрон. научн. журн. – 2018. – № 3 (45). – Рэжым доступу: http://7universum.com/ru/psy/archive/item/5600. – Дата доступу: 24.11.22

3. Рагуля, А. У. Зерне хараства: культурфіласофскія нататкі / А. У. Рагуля. – Мн. : Выд. В. Хурсік, 2013. – 272 с.